Нóги яго́ дýмано перабúць. Янá табѣ́ не трэ́ба бýдя'?— Нѣ', дя̀тúна, éта касá ящэ́ мнѣ трэ́ба будя'!

---

1) Змóкла — сгорѣла.

§ 138.

Возможно обращеніе личнаго предложенія въ форму безличнаго:

Гарóхъ паѣ́ло мóшками. Балóта пакры́ло тума́номъ. Прапа́дакъ ў яго́ ве́льми вяли́ки', не пры насъ гавóрано.

§ 139.

Высшая степень качества выражается повтореніемъ слова и протягиваніемъ голоса:

Пашóў па вýлицы бальшэ́нны'-прабальшэ́нны' волъ! Павóўкса па балóту вялúзны'-вялúзны' воўкъ! Аста́лиса атъ ма́тки драблю́сенькія-драбнюсенькія сяро́тки!

§ 140.

При числительныхъ пять, шесть ... существительное «годъ» ставится въ родительномъ падежѣ множ. числа, а существительное «верста» — иногда въ двойственномъ числѣ:

Майму́ дятя́ти пъять гадóў, а жóнцы два́тцать шес'ь гадóў. Атъ Жы́тина да Ляўкóў дéсять вярсьтé па бíтаму шляху, а чэ́разъ балóта въёрстъ семъ.

§ 141.

Слѣдующіе вопросы встрѣчаются на каждомъ шагу:

Гдѣ жъ ты быў дóсюль? Ти ты é́тага не ба́чыў? Ти ба́тька жъ вýча худóму? Чаму́ ты не прышóў? Што é́та за люди? А гдѣ жъ гы буваў, сьвяты́' Микóла? Гдѣ жъ ты валачы́уса, сьвяты́' Юрэй? Якъ ты ма́есса? Ча' ты сюды прывоўкса?

§ 142.

1. Дополненіе ставится въ слѣдующихъ падежахъ:

Ёнъ навýчыть яго́ ро́зуму, а не лихóму. Слýхай людéй разумнéйшыхъ. На́шы хлóпцы ўсю ночъ вартýютъ: сьтярагýть я́блакъ. Трэ́ба паглядéть é́тага дúва. Ёнъ мяне́ не пытóўса, а ў

тябе́ пытбу́са. Сабира́юсъ дать ямý дыхту. Дать табѣ́ па́ру за твою́ рабо́ту.

2. Употребляются слѣдующія выраженія:

Паѣ́хаў па 'въёсъ. По́йдомъ ў грыбы́! Ты хади́ла па грыбы́? — Нѣ', я хади́ла ў я́гады! Кали́ мы хади́ли па грыбо́хъ, то знайшли́ птýшачча гнязьде́чка. Да каго́ жъ, кумъ, пить мнѣ гарэ́лку? — Пи' къ ба́тька Аза́ру! Мы е́та дѣ́ла зро́бимъ ўдвохъ. Мы ўдесятяро́хъ скаси́ли ўвесь лугъ и по́плаў за 'динъ день.

Ўсягды́ по́мни на Бо́га! До́куль ты бу́дешъ сьмѣ́ятьца зь мяне́? До́ўга ёнъ ра́даваўса зь е́стага; 'мѣў съ таго́ патѣ́ху. Ўсе ты зь мяне́ сьмяе́сса. Схаджу́-ка я да суседа. Не даступі́ўса я да ба́тюхны. Хлапе́цъ Кузьма́ пашо́ў за́мужъ за дзўку Хрысьти́ну.

§ 143.

Встрѣчаются выраженія:

Дабра́ съ таго́ ма́ла, што ёнъ зьдзка́етца зь гаўя́ди. Ёнъ худы́' зь ви́ду. Ня будя' до́брага хаджа́ина съ твайго́ сы́на. Не журы́съ ты на́ми.

§ 144.

Тоже выраженія:

'Азьми́ мяне́ за ня́ньку за цэ́лая лѣ́та! Паѣ́ду къ'сьтю свой на савѣ́тъ. Да я жъ таго́ варабъю́ адда́мъ суди́ть ко́ршыку.

§ 145.

Согласованіе не по роду, а по окончанію:

Насъ рассу́дить мирава́я судьдя́. За пана́ми ў насъ бо́ў се́льская галава́.

§ 146.

Множественное число вмѣсто единственнаго:

Ёнъ сваймі ле́сьтями духъ вымая', а гаво́ркамі и галаву́ адура́я'.

§ 147.

Употребляются выраженія:

Мяне́ набіў той хло́пецъ, што сяди́ць на пры́зьбя. Прахъ яго́ ве́дая', што мнѣ рабі́ць зь е́стымъ хлапцо́мъ: ня слу́хая' ёнъ мяне ниско́льки. На маю́ да няўда́шачку ў цэ́ломъ сьвѣ́тя нѣ́тъ! Прышло́ ўрэ́мя радо́мъ брать. Царэ́вичъ росъ не па гадо́хъ, а па днёхъ.

Пѣсни сакуновъ.

Каля́дскія.

Щадры́ пяю́тца пе́радъ Васи́льемъ ве́чаромъ пыдъ ха́тами.



I.

До́бры' ве́чаръ тамў́,
Хто ў е́томъ дамў́
Ти сьпи́ць, ти ляжы́ць,
Гавары́ зъ на́ми,
Зъ на́ми гавары́,
Зъ до́брыми людьми́!
Да вы́йди на дворъ,
Зирни́ ў щы́ры' боръ,
Што ў щы́рамъ баръ́
Шуми́ць да гуди́ць,
Шуми́ць да гуди́ць,
Ро́йная ма́тка йдець.
Ро́йная ма́тка йдець,
Раёчки вядзе́ць.
Ой, вядзе́'-вядзе́'
Да й научая́':

Садѣ́тесъ, райки́,
У́ ста́рыя ульли́,
А я, ста́рая,
У́ но́венькомъ ся́ду.
Изъ васъ, малады́хъ,
Сало́дки' мяда́,
Изъ мяне́, старо́й,
Жо́у́тыя васка́.
Сало́дки' мяда́ —
Сыту́ сыти́ти,
Жо́у́тыя васка́ —
Сьвѣ́чы сука́ти.
Сыту́ сыти́ти —
Сы́на жани́ти,
А сьвѣ́чку сука́ть —
Дачку́ аддава́ть!

II.

Да у́ по́ли, у́ по́ли
На́крэстъ даро́ги,
На́крэстъ даро́ги
Стая́ть дьвѣ́ хво́и.
На тыхъ хво́ячкахъ
Сьвѣ́чы гарэ́ли.
Йдѣ́ слёзка у́ка́пня',
Тамъ мо́ра ста́ня.
На томъ жа мо́ры
Самъ Бо́гъ купо́у́са
Зь Ису́сомъ Хрысто́мъ,
Сьвяты́мъ ражджаство́мъ!

III.

Кару́тки сьви́тки —
Трасу́тца лы́тки.

Ба́ць̀ка сварыў̀са,
Кабъ не пазьні́ў̀са.
Ма́ць̀ци каза́ла,
Штобъ да́ли са́ла!

С. Жы́ць̀инъ, Бабру́ськага ў̀е́зда. 19 іюня 1911 г. Пе́ла жанчы́на Алёся Я́цка, 26 гадо́ў̀.

Вясе́ннія.

Пяю́ць̀, якъ ганя́ю́ць̀ ў̀ по́ля гаў̀я́дь.



I.

Волъ бушу́я'
Вясну́ чу́я'.
Во́ранъ кра́ча',
Сы́ра хо́ча'.
Дз̀е́ў̀ка пла́ча',
За́мужъ хо́ча'!
Не бушу́й, во́ле,
По́йдешъ ў̀ по́ле,
Да и ў̀ по́ли
Нааража́сса!
Не плачъ, дз̀е́ў̀ка,
По́йдешъ за́мужъ,
Да й за́мужэмъ
Нажыве́сса!
Нааражу́са,
Волъ уле́гса.

Во́ранъ кра́ча',
Сы́ра зьѣ́ўшы.
Дѣ́ука пла́ча,
Сы́на 'мѣ́ўшы!

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ўе́зда, 21 іюня 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Хрысьці́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.

II.

Була́ ў ма́тки
Дачка́ адна́,
Адна́ дачка́ —
Рабо́тницка.
Ма́тка дачкі́
Ня 'тдава́ла,
Ўсе на вясну́
Аткладала.
Дачкі́ за́мужъ
Ня 'тдава́ли,
А сваго́ве
Дахаджа́ли,
Ўсе ма́таццы
Дакуча́ли,
Ўсѣ паро́ги
Па'тбива́ли.
Прышла́ вясна́ —
Дачка́ ўме́рла.
Пла́ча ма́ці
Па дзіця́ці:
Дзіця́ жъ маé
Маладо́я!
Да я жъ цябе́
Ня 'тдава́ла.
А ўзёў зя́цю,
Не пыто́ўса

И ў но́жачки
Не склане́ўса.
Што дубо́чки —
То сват о́чки;
Бяро́зачки —
То сва́хначки;
Што игру́шки —
Да то дру́жки,
А хво́ячки —
Прыда́начки!..
Прышла́ ма́ці,
Дачку́ бу́дить:
Ой, ўстань, дачка́
Рабо́тницка!
Дзе́ла тваé
Ня ро́блена:
Ха́та й се́ни
Ня ме́тяны;
И ло́жачки
Ня мы́тыя,
И сто́лики
Ня кры́тыя.
Падру́жачки
Даўно́ завю́ць
Гаўя́дачки
Ў по́ля гани́ць!..
— Ма́ці жъ мая
Старе́нькая!
Дзе́ла маé
Паро́блена,
Ха́та мая́
Подме́тяна,
Ло́жки маé,
Памы́тыя;

Сталы́ маé
Накры́тыя,
Гаўя́дачка
Ня ры́кая'!..

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ўе́зда. 28 іюня 1911 г. Пе́ла ба́бухна Аўдо́ць'я Шачо́къ, 80 гадо́ў.



III.

Ой, прышла́ вясна́
Красна́,
Чужы́я мало́дки
Ткуть кросна́.
А я, маладе́нька,
Не пра́ла,
Пыдъ лёдъ куде́льки
Пуска́ла.
— Плывце́ць, куде́льки,
Валакно́мъ,
Ка мнѣ, маладе́нькай,
Палатно́мъ!
Да ўсѣ дзе́вачки
Сьмяю́тца,
Якъ ты́я куде́льки
Прадзю́тца.
Да ўсѣ лю́дечки
Ди́вятца,
Чыé то куде́льки
Бе́лятца.

Да е́та жъ таé
Гульта́йки,
Да што стаяла
'Ля пе́льки!

С. Жы̀тинъ, Бабру́ськага ўѣзда. 26 іюня 1911 г. Пѣла жанчы̀на Палагéя Жы̀тинка, 45 гадо́ў.

Вялико́днія.

Пяю́ць на бясе́дя ў ба́бки на други́' день, а ў кумо́ў на трэ́йци'.



I.

Я 'тъ ба́бачки йду,
Якъ пчо́лка гуду́.
Да й скланю́ я
Гало́вачку
На мило́га
Пасьце́лячку,
Лягу-прызасну́.

Мой миле́ньки' к'роль,
Атчы̀нь но́вы' дворъ:
Иде́' твая́
Миле́нькая
Атъ ба́бачки
Пъяне́нькая,
Ци радъ жа ты ей? —

— Чаму́ жъ я не радъ,
Мой ты винагра́дъ,

Будя' гука́ть
Мужъ жъ жано́ю:
Ты 'дно сло́ва,
Я друго́я,
Да у̀ насъ будя' ладъ!..

II.

У̀ майго́ дѣ́дка пъютъ,
Мяне́ не завýтъ.
Ой, вы́йду жъ я
На вýлачку,
Да й зайгра́ю
На дýдачкý,
Ти не пазавýтъ.

Набяру́са у̀ма́ —
Пайдý я сама́.
Ти не ска́жа'
Мой дѣ́дачка:
— Сади́съ за столъ,
Дарагéнька,
Го́сьтейка мая́!..

III.

Ой, даýно́-даýно́
Я у̀ кумка́ была́.
Да у̀жэ жъ мая́
Даро́жачка
Къ дарого́му
Маймý кýму
Бы́льлёмъ заросла́.

Ой, быльлёмъ-быльлёмъ,
Да й былúнкаю!
Ой, я у̀ свайго́

Да кумо́чка
Даўно́ була́
На бясѣ́дя
Вечары́нкаю.

Гальлё паламлю́,
Листо́къ разграбу́,
Жыгу́чаю
Крапи́вачку,
Чырво́наю
Кали́начку
На́-бокъ расхину́!..

С. Жы́тинъ. Бабру́ськага ўѣ́зда. 1 іюля 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Палагея́ Жы́тинка, 45 гадо́ў.

Валачо́бныя.

Спокойно.



I.

Ой, на пе́рвы' день
Да на Вяли́къ день,
Ой, зьбира́лиса,
Рахава́лиса
Малады́я хло́пцы —
До́брыя мало́йцы.

Ой, ишлі́ жъ яны́,
Да й прайшлі́ яны́
Ў'се дарóгаю
Да широ́каю,
Ў'се играю́чы
Да гуля́ючы,
Лявéцкага сялá
Да шука́ючы;
Слáвнага му́жа,
Гаспадáра Йвáна,
Вапраша́ючы,
Ў'се пыта́ючы.
— Ой, чаго жъ вы мяне́
Да пыта́еце,
Ці майго́ двара́
Вы не зна́еце?
Ой, да мой жа дворъ
Знакамі́сьценьки',
Да вярэ́ницки
Сьціразло́тныя,
А засóвачки
Ў'се цясóвыя.
На маёмъ двара́
Да яго́нь гары́ць,
Што яго́нь гары́ць
Ў'се калі́навы',
А дымóчакъ идe'
Ў'се малі́навы',
'Ка́ла таго́ ягню́
Ў'сѣ сьвяты́я сядя́ць;
Што сьвяты́я сядя́ць,
Ў'сѣ апóсталы.
Щытава́лiса —
Рахава́лiса:

— Ой, каго́ жъ е́та
Ту́така не́ту? —
Мижъ на́ми не́ту
Да сьвято́га Ю́ръя!
— Ой, каму́ жъ е́хать
Па сьвято́га Ю́ръя?
— Ты, сьвяты́' Ильля́,
Асядла́й каня́;
Асядла́й каня́
Да бѣга́й па Ю́ръя!
Ильля́ са двара́,
А Ю́рэй на дворъ.
Ёнъ парасі́ўса,
Ўвесъ намачы́ўса.
— Ой, идѣ жъ ты бува́ў,
Да сьвяты́' Ю́рэй?
— Я па по́лю хадзі́ў,
Лю́дямъ жы́та расі́ў.
Я ўсе жы́та расі́ў,
Ба́тька-Бо́га прасі́ў:
Ради́, Бо́жа, жы́та
На но́вае ле́та
Ражаи́стае,
Каласи́стае!
Я па ха́тамъ хадзі́ў,
Ба́тька-Бо́га прасі́ў,
Ўсѣмъ здаро́ўя дары́ў,
Яго́ лю́дямъ дялі́ў.
Я па хлёвамъ хадзі́ў,
Ба́тька-Бо́га прасі́ў;
Лю́дя́мъ ща́сьця насі́ў,
Ўсѣмъ имъ ста́такъ пладзі́ў.
Я па бо́ру хадзі́ў,
Лю́дямъ пчо́лки садзі́ў,

Ў́се имъ пчо́лки сади́ў,
Ба́тька-Бо́га прасі́ў:
Да ў́нясі́, Бо́жа,
Пчали́наю ма́тку
И раі́стую,
И мяди́стую!..
Ой ты, гаспада́ру,
Ой ты, сла́вны' му́жу!
Ой, ти до́ма жъ ты?
Не тзыва́етца,
Да ў́ но́вай само́рэ
Прыбира́етца:
Ёнъ надяе́' бо́ты
Ў́се чырво́ныя;
Да надяе́' шу́бу
Атласо́ваю;
Да надяе́' ша́пку
Ў́се бабро́ваю.
Ой ты, гаспада́ру,
Ой ты, сла́вны' му́жу!
Ой, ў́стань — не ляжы́,
Да ў́ гунно́ па'ляди́:
Што ў́ тваёмъ жа гуньнѣ
Ў́сѣ сьвяты́я хо́дять.
Ой, пе́рвы' сьвято́къ —
То сьвяты́' Ю́рэй,
А други́' жа сьвято́къ —
Сьвята́я Мико́ла,
А трэ́йти' сьвято́къ —
То сьвяты́' Пятро́къ;
Чатьвъёрты' сьвято́къ —
То сьвяты́' Ильля́;
А пъя́ты' сьвято́къ —
То сьвяты́' Испа́съ...

Ой, сьвяты́' Ю́рэй
Ста́такъ запаса́я'.
Сьвята́я Мико́ла
Ярь засява́я'.
А сьвяты́' Пятро́къ
Пчо́лки насажда́я';
А сьвяты́' Ильля́
Жы́та зажына́я',
А сьвяты́' Испа́съ
Жы́та засява́я'!..

Т́е́рабутъ, Игу́меньскага у́е́зда. Пе́ў дзе́дъ Зьми́т́еръ Но́викъ, 70 гадо́ў.

Тро́ицкія.

Дзе́ўки гу́шкаютца и пяю́ць ля Тро́йцы:



I.

Да на́ ву́лицы
Ярыло́вица!
Ой, т́я́жка хло́пцамъ
Пятро́вица.
Да суди́ жъ, Бо́жа,
Пятра́ даждаць;
Да Пятра́ даждаць,
Хле́ба нажаць.
Да тагды́ по́йдомъ
У Жы́т́инъ ў дзе́ўки[1])!

1) Ит'и ў дзе́ўки — итти въ сва́ты.

Ў Жы́тинѣ дзе́ўки
Харо́шыя.
Ой, да ўсѣ жъ яны́
Бага́тыя,
Даю́ць пада́рки
Наме́тныя.
А ў Крамку́ дзе́ўки
Худо́баньки,
Даю́ць пада́рки
Крапі́ўныя!

II.

Да на ву́лицы
Кра́ю нѣ́ту.
Да каго́ жъ е́та
Ту́та нѣ́ту?
— Маладо́й нама́
Пала́жэчки!
— Да ягла́ жъ ба йна
Кало́даю,
Да кало́даю
Дубо́ваю.
Да штобъ на ду́ба
Яна́ лѣ́зла,
Да дубо́ваю
Кару́ гры́зла.
Да штобъ на ду́бя
Го́льля лама́ла.
Штобъ сваѐ зу́бы
Паламала́,
Намъ ты́я зу́бы
Прадава́ла!..

III.

Да йшлі́ хло́пцы
Да мяжэ́ю,
Пилі́ яны́ мъёдъ
Да дяжэ́ю!
Да йшли дзе́ўки
Ватага́ю,
Да пилі́ сма́гу
Бакла́гаю!

IV.

Сяго́ньни Йванъ
Зо́ўтра Мико́ла
Пагна́ли хло́пцы
Саба́ки ў по́ля.
Да ўсе саба́ки,
Ўсе лы́сыя.
Да 'дна́ су́чка
Рабе́нькая,
Ива́ну жо́нка
Миле́нькая,
Што миле́нькая —
Дараге́нькая!..

V.

Да на ву́лицы
Два мало́йца
Да злавіли жа́бу
На каро́баццы.
Пащыпа́ли жа́бу
На́шы хло́пцы;
Да й падяли́ли
Па кро́шэццы.

Дастáласъ Йвáньку
Цэ́лая жáба,
Спалюби́ла ягó
Стáрая бáба!

С. Жытинъ, Бабру́ськага ўе́зда. 26 іюня 1911 г. Пе́ла жанчы́на Палагéя Жы́тинка, 45 гадóў.

VI.

Хмель на тычы́нку
Навива́етца.
Йва́нька дачкóй
Набива́етца:
— Ой, зя́тю, зя́тю,
'Азьми́ маю́ дачку́.
Ой, мая́ жъ дачка́
Да рабóтница,
На па́ству жане́',
Куде́льки праде́',
А съ па́ствы жане́' —
Пачы́начки ўе'
Пры́дя' ня́дзе́ля —
Мяшóкъ надзе́ня';
Пры́дя' друга́я —
Мяшка́ не 'мая'!

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ўе́зда. 4 января 1911 г. Пе́ла жанчы́на Хрысьці́на Кашы́цкая, 28 гадóў.

Жнива́.



I.

Да мы жа́ли,
Не ляжа́ли,
А у́се по́ля
Рачко́мъ сайшли́.
Да на мяжа́
Вяно́къ найшли́,
На гало́у́ку
Вазлажы́ли
Гаспада́ру
Да прыне́сли.
Ой, 'азьми́ нашъ
Да вяно́чакъ,
Што вили́ мы
Тыи́-дянёчакъ.
Нашъ вяно́чакъ
Залаце́ньки' —
Заплати́ намъ
Дараге́нька.
Заплати́ намъ
Чы́стымъ сро́бромъ,
У́се чырво́нымъ
Да зо́латомъ!
У́ насъ сяго́ньни
Дажы́начки —
Папо́штуй жа
Сваё жне́йки.

Гаспада́ракъ
У́ по́ли хо́дить
Да Го́спада
Бо́га про́сить:
— Ка мнѣ, Бо́жа,
Са снапа́мы,
Зь вяли́кими
У́се капа́мы;
Зь высо́кими
Да ськирта́мы
И съ по́у́ными
Азыро́дамы.
У́ мяне́ гунно́
Да вяли́коя,
Застаро́нки
Шыро́кія,
Гро́нды маé
Прасто́рныя!

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага у́ѣзда. 30 іюня 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Матру́на Бара́нъ, 50 гадо́у́.

II.

У насъ у́ по́ли
Дажы́начки,
До́ма жъ Богъ доу́
Ради́начки.
Па́ни сы́на
Наради́ла,
Хо́рашенька
Вы́растила;
На ко́ника
Пасади́ла
Да на войну́

Вы́правила:
— Ѣдь, сынóчакъ,
На вóйначку,
Да не забýдь
На мáтачку!
Клапатýя'
Вéльми мáти
Па раднéнькомъ
Да дитя́ти.
Сынóкъ мáтку
Утяшáя',
Ей вѣстачку
Прысылáя':
— Не клапатýй,
Маí мáти,
Ўсе па сваёмъ
Да дитя́ти:
Да Гóсподъ Богъ
Нада мнóю,
Сúвы' кóникъ
Пада мнóю!

С. Жы́тинъ, Бабру́ская ўѣзда. 30 іюня 1911 г. Пѣла жанчúна Палагéя Жы́тинка, 45 гадóў.

III.

Нашъ бáтюшка
Ў варóтъ стаúць,
А шáпачку
Ў рукáхъ дяржы́ць.
Ёнъ Гóспада —
Бóга прóсить:
— Ка мнѣ, Божа,
Прыдú ка мнѣ!
Ўсе зъ густы́ми

Да снапа́ми
У́се шъ ча́стыми
Аба́бками
И зъ бальшы́ми
Да капа́ми.
У́ мяне́ гунно́
Вяли́кое,
Застаро́нки
Высо́кія,
Пераплёты
Шыро́кія!

С. Жы̆тинъ, Бабру́ськага у́ѣзда. 2 января 1911 г. Пѣла жанчы́на Алёся Я́цка. 26 гадо́ў.

IV.

Ой, за бѣ́лымъ
Бярэ́зьничкомъ
Нашъ пани́чакъ
Паѣжджа́я',
Сваё́ жнёйки,
Прыганя́я':
— Не лянѣ́ць̆тесъ,
Жнёйки, жнѣ́ць̆тя,
Са́ми сябе́
Не пазьнѣ́ць̆тя,
Каня́ майго́
Не тамѣ́ць̆тя!
Жнёйки маё́
Малады́я,
А сярпо́чки
Залаты́я!

С. Жы̆тинъ, Бабру́ськага у́ѣзда. 22 іюня 1911 г. Пѣла ба́бухна Аудо́ць̆тя Шачо́къ, 80 гадо́ў.

Пяю́ць обы́-кали.



Ой, запѣ́й-запѣ́й,
Жаваро́начка,
Вясно́й сѣ́дячы
На прата́линцы!
Да й пада́й го́ласъ
Чэ́разъ тёмны' лѣсъ;
Чэ́разъ тёмны' боръ
У́ Масквў ка́менну.
Што ва той Масквѣ́
Маладёнъ сядзи́ць;
Ёнъ сядзи́ць-сядзи́ць;
Ро́ўна дзе́вяць годъ.
На десяты' годъ
Стоў пісьмо́ писа́ць.
Ёнъ пісьмо́ пи́ша'
Къ атцў-ма́тэры,
Кабъ а́тецъ-ма́ти
Не журы́лиса,
Жана-мо́лада
Штобъ не пла́кала!

Щы́ткавичы, Игу́меньскага ўе́зда. 6 іюля 1911 г. Пѣ́ў гаспада́ръ Аляксѣ́й Пля́ска, 45 гадо́ў.



Ой, пайду́ я
Гука́ючы,
Сваé дóли
Шука́ючы.
Ат'зва́ласа
Мая́ дóля
Да па тóй бокъ
Си́ня мóра.
Плыви́, дóля,
За вадбю,
А я услéдъ
За табóю.
Прыплывóмъ мы
Къ бераж'э́чку,
Да й паста́номъ
На брус'э́чку,
Пыдъ дéравомъ —
Дерав'óчкомъ,
Зеляне́нькомъ
Ўсе кляно́чкомъ.
Мы вы́щыкномъ
Па листóчку
Да й напи́шэмъ
Па писмóчку;
Да й пашлёмъ ихъ
Къ атцу́ — ма́тцы,

Няха́й яны́
Не жура́тца.
Тяпе́ръ жа я
Жыву́ ў па́рэ —
Дало́-до́лю
Си́ня мо́ра!..

С. Жы̆тинъ, Бабру́ськага ў̆е́зда. 29 іюня 1911 г. Пе́ла ба́бухна Аў̆дотьтя Шачо́къ, 80 гадо́ў.



Ве́чаръ тёмны' —
Ве́чаръ тёмны',
Да й но́чка видна́.
Сьвёкаръ до́бры' —
Сьвёкаръ до́бры',
Сьвякру́ха лиха́.
Не пуска́я'
На ву́лицу,
Што я малада́.
— Пусьти́-пусьти́,
Ста́ра ма́тка:
Я не забаў̆лю́сь;
Да ў̆сёмъ хло́пцамъ
Дамъ дабры́день
И наза́дъ вярну́сь!
Чэ́ша-чэ́ша
Хло́пецъ ку́дры,
Якъ дяви́ца ко́сы.

Да й пажану́
Си́вы' во́лы
На ра́ньнія ро́сы.
Пи́ли-е́ли
Си́вы во́лы,
Да ў́сѣ ў шаръ паста́ли.
— А йдѣ жъ на́шы
Аратыя
Што на́ми ара́ли?
— Да ў́жэ жъ ва́шы
Аратыя
Касара́ми ста́ли.
Пакаси́ли
Чаро́тъ-ло́зу
И се́на пагрэ́бли!
— Ба'да́й се́на
Тлянёмъ се́ла,
И каса́ зами́ласъ.
Бада́й твая́,
Мой миле́ньки',
Ма́тухна страми́ласъ,
Якъ за мно́ю
Маладо́ю,
Ў́сю но́чку гани́ласъ.
Яжъ, малада́,
Ў́тяка́ла
Чэ́разъ агаро́ды,
Патапта́ла
Ру́ту-мъя́ту,
Нараби́ла шко́ды!

С. Жы́тинъ, Бабруськага ў́ѣзда. 26 іюня 1911 г. Пѣла жанчы́на Палагея́ Жы́тинка, 45 гадо́ў.



Тамъ за гаро́ю
Да бу́енъ вѣ́трыкъ вѣ́я'.
Маладая́ ўдбу́ка
Да пшани́чаньку сѣ́я',
Яна́ жъ сѣ́ючы
Да съ сабо́й гаварыла:
— Ой, дай жа, Бо́жа,
Кабъ пшани́цка ўради́ла!
Да йщэ жъ ўдбу́ка
И дамбу́ки не за́йшла,
А ўжэ ўдбу́чына
Да пшани́чанька ўза́йшла.
Да йщэ ўдбу́ка
И на ла́ўцы ня сѣ́ла,
А ўжэ жъ да яе́
И пшани́цка пасыпѣ́ла!
Вотъ прышла́ ўдбу́ка
Да пшани́цки глядѣ́ти,
Ажно́ вы́вела
Перапъёлачка дѣ́ти.
— Ой, дѣ́тки жъ мае́,
Да йдѣ́ жъ васъ падѣ́ти?
— Ой, ма́тка на́ша,
Не журы́са ты на́ми!
Парасту́ть кры́лья,
Разьлято́мса мы са́ми.

Са́ма' бо́льшая
Да на боръ паляцѣ́ла,
А ўсѣ другі́я
Да на щы́рыя лу́ги
И заста́ласа
Перапъёлачка адна́!

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ў'ѣ́зда. 4 января 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Хрысьці́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.



Ой, я́вару, я́вару,
Я съ табо́ю гавару́!
Съ табо́й, я́варъ, гавару́
Надъ рако́ю сто́ячы,
Да цьвято́чки ло́мячы,
Да ў пучо́чки ва́жучы,
На Дуна́й пуска́ючы.
— Плывѣ́ця вы, цьвято́чки,
Ажъ да маé ма́тачки!
Ой ты жъ, ма́тачка мая́,
Наштó жъ мяне́ аддала́,
До́брай до́ли не дала́;
Вы́брала мнѣ дружы́ну,
Якъ го́р'кую аси́ну!
Якъ аси́нка зацьвяцé',
Дакъ цьвято́чэкъ атпадé',

Якъ аси́нка на бо́рэ',
Такъ я, мло́да, у го́рэ.
Якъ ҭвятбчэкъ на вадзе́,
Такъ я, мло́да, у бядзе́!

С. Жы́ҭинъ, Бабру́ськага ўе́зда. 16 іюля 1911 г. Пе́ла жанчы́на Хрысьҭи́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.



Ой, хаджу́ я, да паха́джаю
Да па чы́стаму по́лю.
Ой, се́ю я, да рассе́ва́ю
Сваю́ го́р'кую до́лю
Расьҭи́ жъ, мая́ го́р'кая до́ля,
Ўсе густы́ми куста́ми!
Тьвяҭи́ жъ, мая́ го́р'кая до́ля,
Ўсе ро́зными ҭьвята́ми.
Да нивбдинъ такъ ҭьвѣ́ҭъ не харо́шъ,
Да якъ той василёчэкъ;
Нихто́ не милъ, да нихто́ не любъ,
Да якъ ве́рны' дружбчэкъ!

С. Жы́ҭинъ Бабру́ськага ўе́зда. 7 января 1911 г. Пе́ла жанчы́на Хрысьҭи́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.



Ой, да ў по́ли,
Ў по́ли на разо́рэ,
Тамъ стая́ла
Ро́ўныхъ два дубо́чки,
Схили́лиса
Вяршо́чки ў клубо́чки.
Тамъ сядзе́ли
Да два галубо́чки.
Пи́ли-е́ли,
Да ў лѣсъ палятзе́ли,
Са́ми съ саббо́й
Ро́чы гавары́ли:
— До́бра таму́
Да хто ажані́ўса,
А йшэ лу́ччы,
Да хто не жані́ўса.
Ў жана́тага —
То сьмерць, то ради́нки;
Ў хало́стага —
Што день вечары́нки.
Ў жана́тага —
Дро́бны' дзе́тки пла́чуць,
Ў хало́стага —
Кра́сны' дзе́ўки ска́чуць!

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ў'ѣзда. 24 іюня 1911 г. Пе́ла жанчы́на Хрысьці́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.



Ой, була́ жъ я
На ры́начку,
Да пила́ мъёдъ —
Гарэ́лачку.
Баю́са жъ я
Дамо́ў ить'ти́:
Бу́дя' мяне́
Мой мужъ би́ти.
Бу́дя мяне́
Мой мужъ би́ти,
Да не́каму жъ
Барани́ти.
Да е́' ў мяне́
Мой сьвъёкарка —
Да якъ ро́дны'
Мой ба́тюхна.
Ёнъ жа мяне́
Абарони́ть,
Сынка́ свайго́
Угаво́рыть:
— Сыно́чку мой,
Галубо́чку,
Ня би' жъ яе́
У гало́вачку;
Да гало́ўка
Яе́ кво́ла,
Спахме́льлика
Няздаро́ва.

Набъе́шъ яе́
Тьвярбзаю
Да бе́лаю
Бярбзаю!

Юровичы, Бабру́ськага у́е́зда. 17 іюня 1911 г. Пе́ла жанчы́на Ары́на Кажэ́ръ, 35 гадо́ў.

Спокойно-широко.



Хо́дить-хо́дить
Праўда́лы' малбйчыкъ
Па крутбй гарэ́.
Чэ́ша-чэ́ша'
Ёнъ кудёрачки
Да на галаве́.
Чэ́ша' сваé
Да кудёрачки
Раскида́ючы',
На чужы́я
Да харо́шыя
Заглядаючы.
— Ой, чужы́я жъ
Да харо́шыя —
Якъ ружо́вы' тьвéтъ,
А на маю́
На няўда́шачку
Ў бе́ламъ сьве́тя нéтъ!

Ой, вазьму́ жъ я
Да няўда́шачку
За пра́ву' руку́.
Ой, пущу́ я
Да няўда́шачку
На бы́йстру' раку́.
Плыви́-плыви́,
Ой, няўда́шачка,
Да ўслѣдъ за вадо́й
Зграво́уса
Да я, маладе́ньки',
Жывучы́ съ табо́й!
Засталáса
Да каля́сачка,
Ящэ́ си́вы' конь,
То́льки се́сьцi
Да пае́хацi
Къ чэ́щухнѣ на дворъ.
— Ти здаро́ва,
Мая́ чэ́щухна?
До́бры' табе́ день!
Пасавѣ́тай,
Мая́ чэ́щухна,
Якъ на сьвѣ́ця жыць?
— Ба'да́й жа ты,
Да мой зя́цюхна,
Вѣ́ку не даждо́ў,
Якъ ты маé
Да диця́тухна
За 'динъ день сьцяро́ў!

С. Жы́цинъ, Баро́уськага ўе́зда. 29 іюня 1911 г. Пе́ла ба́бухна Аўдо́цця Шачо́къ, 80 гадо́ў.



Ой, сядзíць го́лубъ
Да на дубо́чку,
А галу́бка на бяро́зя.
Ой, у всѣхъ людзе́й
Да мужы́ до́ма,
А мой миле́ньки' ў даро́зя.
Да спусьцíса ты,
Сíвая галу́бка,
Да зьбярозы дадо́лу!
Ой, прыбу́дь-прыбу́дь,
Мой миле́ньки' другъ,
Да зъ даро́ги да до́му!
Ой, да рыкнула
Да тава́рынка
Ў чэрадзе́ на по́ли.
Ой, загнѣвоўса
Мой миле́ньки' другъ
Да й вячэ́рать ня хо́ча'.
Ой, хать гнѣвайса,
Хать ня гнѣвайса,
Да прасíць ня бу́ду!
Ой, няха́й та́я
Дя тябе́ про́сить,
Да што твой пярсцёнъ но́сить!

С. Жы́тинъ, Бабруськага ўѣзда. 4 января 1911 г. Пѣла жанчы́на Хрысьцíна Кашы́цкая, 28 гадо́ў.

Живо.



Ты, дубо́чэкъ зелянёньки',
Шыро́къ листо́къ на табѣ́!
Ты, каза́ча маладёньки',
Нѣ́ту про́ўдачки ў тябе́!
Ты бажы́ўса, ты рачы́ўса:
— Не паки́ну я тябе́!
Тяпе́ръ мяне́ пакида́ешъ,
Сабѣ́ лу́ччаю бярэ́шъ!..
Пайду́ зъ го́ра у чы́ста по́ля,
Да й са́ду я пыдъ лужко́мъ;
Ой, пыдъ лу́гомъ, пыдъ лужэ́чкомъ,
Пыдъ раки́тавымъ густо́мъ.
Ой, гукну́ жъ я, маладёнька,
Сваи́мъ то́нкимъ галаско́мъ:
— Девяра́тки, ро́дны' бра́тки,
Запрага́йтя вы валу́ў;
Запрага́йтя па́ру валу́ў,
Запрага́йтя другу́ю,
Да й паѣ́домъ ў чы́ста' по́ля
Ўжэ пало́саньку ара́ць!
Аро́мъ го́ни и другія —
Канца́ кра́ю не вида́ць.
Ой, пасѣ́мъ жы́та жме́ню,
А другу́ю жъ ячме́ню.

Нямá зъ жы́та узыхóду,
А ни рáньнія расы́!..
Нѣ́ту дѣ́ўцы красатóсьци,
Нѣ́ту рýсыя касы́!..

С. Жы́цинъ, Бабрýскага ýѣ́зда. 4 января 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Хрысьцíна Кашы́цкая, 28 гадóў.



Я играю на китáюшку,
Самá сябé весялю́.
Нихтó гóрушка ня вѣ́дая',
Якъ я зь мíлымъ ра'страю́сь.
Пайдý зъ гóра ў чы́ста пóля,
Да й сáду я пыдъ лужкóмъ,
Што пыдъ лýгомъ — пыдъ лужáчкомъ,
Пыдъ ракíтавымъ кустóмъ,
Да й гукнý я, маладéнькая,
Сваíмъ тóнкимъ галаскóмъ:
— Вы, кустóчки ракитóвыя,
Прыхинѣ́цеса къ зямлѣ́!
Ой вы, птáшэчки вясёлыя,
Вы прапéйця пéсьню мнѣ́!
Вы, зьвярóчки, вы сакóлики,
Прыгарнѣ́цеса ка мнѣ́.
Разнясéця маé цéлушка
Па кавáлачку сабé.
Разальéця кроў гарáчаю
Па крутéнькимъ беражкáмъ.

Занясе́ць да й гало́вачку
Къ майму́ ба́цюшку на дворъ.
Занясе́ць маé се́рдэнька
Къ майму́ ми́ламу за столъ.
Няха́й ба́цька зъ ма́ткай вѣ́дають,
Што ў дачу́шки душы́ нѣ́ць.
Няха́й ми́ленькі' мой вѣ́дая',
Што канча́ецца любо́сць.

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ўе́зда. 18 іюня 1911 г. Пѣла жанчы́на Хрысьці́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.

Спокойно-широко.



Ой вы, галубо́чки,
Галубы́ сивы́я!
Ой вы, маé бра́тки,
Бра́тки малады́я!
Запрага́йць ко́ні,
Ко́ні варань́я
Ѣ́дом ъ нагань́ці
Лѣ́ць малады́я!
Ко́ні перагна́ли,
Лѣ́цяй не нагна́ли.
Ўжэ нагна́ли лѣ́ць
На ли́павом ъ мо́сьць.
— Вярнѣ́цеса, лѣ́ць,
Наза́дъ ка мнѣ ў го́сьць!
— Нѣ', мы не вярно́мся,
Бо нима́ для чо́га.

Булó не ҭяра́ҭи
Здарбу́ейка сво́’го!..
Паҭера́ла лѣ́ҭя,
Патера́ла во́чы
Ў се свайго́ мило́га
Зъ дарóжачки жду́чы.
Ў се яго́ я жда́ла,
Жда́ла, не даждала
То́льки сваé во́чы
На вѣкъ паҭера́ла!..

С. Жы́ҭинъ, Бабру́ськага ўѣ́зда. 4 января 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Хрысьҭи́на Кашы́цкая, 28 гадо́ў.

Спокойно.





Ой, пайду́ я ў садъ,
Ў саду́ прахаджу́са.
Да й скало́ла но́жку
На сухую́ йгру́шку.
Бали́ҭь мая́ но́жка,
Да й бали́ҭь бал’на́я.
Любі́ў хло́пецъ дѣ́ўку
Да ўжэ й пакида́я’.
Ой, паѣ́хаў хло́пецъ
Ў но́вый гарадо́чэкъ:
За имъ кра́сна дѣ́ўка,
Да ў яго́ сьлядо́чэкъ.

Яна́ за имъ гна́лась,
Гна́лась, не дагна́ла,
Да на би́тамъ шля́ху
Ў поўдаро́жки ўпа́ла.
Дзе́ўка якъ упа́ла,
Ўпа́ла — прызасну́ла,
Пасяро́дъ даро́ги,
Што се́ра куку́ля!
Наѣ́хали ўла́ны
Ти тры, ти чаты́ры.
Яны́ кра́сну дзе́ўку
Ў зя́ли пабуди́ли:
— Ўстань ты, кра́сна дзе́ўка,
Ўстань да абачхни́са,
Вы́тры сваé слёзки,
Бо́лѣй не журы́са,
Да на насъ, ула́ноў,
На насъ паглядзи́са!
Да у насъ, ула́ноў,
Ко́ни варань ы́я,
Ко́ни варань ы́я —
Сёдла залаты́я;
Сёдла залаты́я,
Са́ми малады́я!..
— Малады́я ўла́ны,
Скажэ́тя мило́му,
Што яго́ дяўчы́ны
Нѣ́тъ ужэ на сьвѣ́тя!..

С. Жы́тинъ, Бабру́ськага ўѣ́зда. 24 іюня 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Палагéя Жы́тинка, 45 гадо́ў.



Ў̀сѣ лю́ди жыву́ць,
Якъ ць̀вятэ́ ць̀вяту́ць,
А я, малада́,
Вя́ну, якъ трава́.
Ки́ну-бро́шу міръ,
Ѣ́ду ў̀ манасты́ръ;
Пайду́ ў̀ манасты́ръ
За мана́шачку,
Да зраблю́ сабѣ́
Сѣ́ни-ха́тачку.
Ой, да вы́рублю
Тры вако́шачки!
Ў̀ пе́рвае вакно́ —
Чы́стыя поля́,
Ў̀ друго́я вакно́ —
Си́нія мара́,
Ў̀ трэ́йцея вакно́ —
Садъ вишнёвеньки'.
Па чы́стомъ по́лю
Лю́ди гаманя́ць.
Па синёмъ мо́ру
Карабле́ ходя́ць.
Ў̀ вишнёвомъ саду́
Салаўе́ пяю́ць.

С. Жы̀тинъ, Бабру́ськага ў̀ѣ́зда. 30 іюня 1911 г. Пѣ́ла жанчы́на Матру́на Бара́нъ, 50 гадо́ў.

Псáлмы.



I.

Йдѣ со́нейка ўзыхо́дить,
Тамъ Прачы́ста Ма́тка хо́дить,
Сь святы́мъ хва́брымъ Ю́раю,
Сь сьвятѝтелемъ Мико́лаю.
Йдѣ сынъ ба́тька пачыта́я',
Ма́тку сваю́ паважа́я', —
Тамъ Прачы́стая бува́я',
Ўсимъ ща́сьцейка пасыла́я'.
Йдѣ сынъ ба́тька не слу́хая',
Ма́тку сваю́ зьневажа́я', —
Тамъ Прачы́ста не бува́я',
Па пра́зь'ничкамъ не ўчаща́я'!
Во́бразъ Лука́шъ малево́ў,
Да ёнъ ве́льми задрамо́ў:
Прачы́стая прыбыва́ла,
Да той во́бразъ атмалева́ла.
Яна́ Луку́ разбуди́ла
Апо́сталу гавары́ла:
Ўста́нь, Лука́шъ, ўжэ часъ праспо́ў
Малева́ны' во́бразъ гато́ў.
Няси́ яго́ на горъ-гару́,
Пасто́ў яго́ на де́раву;
Няха́й лю́ди мо́лятца,
Си́л'на Бо́гу усѣ кло́нятца!

II.

Сынка́ ма́ти спаради́ла
Да й на сьвѣтъ яго́ пусьти́ла.

Сама́ пашла́ даро́гаю,
Даро́гаю шыро́каю.
Сустрэ́ла йна тро́хъ а́нгалоў
— А́нгалы маé милы́я,
Не ба́чыли сы́на майго́!
Сы́на майго́ — Хрыста́ свайго́?
Ади́нъ кажа': не ба́чыў!
Други́' ка́жа': чуть не чуў!
Трэ́йти' кажа': самъ тамъ бо͡уў,
Чу́да вяли́кае ба́чыў —
Тамъ на гарэ́ высо́кай
Стаи́ць цэ́рква малева́на,
А ў той цэ́ркви прэсто́лъ стаи́ць,
На прэсто́ли кни́га ляжы́ць,
Пе́радъ кни́гай сьвяча́ гары́ць.
За прэсто́ломъ сынъ Твой сяди́ць,
Ў пра́вай руцэ́ пяро́ дяржы́ць,
Ў залату́ю кни́гу гляди́ць;
Пи́ша' ду́шы сьмяртэ́льныя.
Ўсѣ ду́шачки псáлмы пяю́ць,
Бо́га хва́лять, до ра́ю йдуць.
Адна́ душа́ саграшы́ла:
Ў суб'о́ту ра́на сьнѣ́дала,
А ў нядзѣ́льку засыпѣва́ла,
Атца́, ма́тку зьневажа́ла!
— Кабъ я то́е вѣ́дала,
Ў суб'о́тачку бъ ня сьнѣ́дала,
А ў нядзѣ́льку бъ не ўспѣва́ла,
Атцу́ бъ, ма́тцы но́ги мы́ла,
Сама́ бъ ту́ю ваду́ пи́ла.

Д. Щы́ткавичы, Игуменьскага ўѣ́зда.
10 декабря 1911 г. Пѣ́ў дѣ́дъ Барысъ Барсу́къ, 60 гадо́ў.

'К А́ З К И.

I.

Рабо́тька-царъ.

Згади́ўса хлапе́цъ къ хаджа́ину ў рабо́тьки. Хлапе́цъ ёнъ бо͡ўў ёмки': ёнъ и ко́сить, ёнъ и жне', ёнъ и ко́ни' и гаўя́дь на па́жу го́нить. Дае' ямў хаджа́инъ ше́с'ьдесятъ рублёў — не бярэ́', дае' се́мдесятъ — то́жа, и во́семдесятъ не хо́ча', а про́сить ўсяго́-на-ўсяго́ тры шэ́ляга за годъ.

Праслужы́ў рабо́тька годъ, палучы́ў сваё тры шэ́ляга и заки́наў ихъ ў раку́. И ты́я тры шэ́ляга патану́ли. Праслужы́ў други́' годъ и ўзно́ў занёсъ сваё гро́шы ў раку́. На трэ́йти' годъ якъ ки́наў ёнъ сваё гро́шы ў раку́, то яны́ не пато́нули, а да́йжа ўсплыли́ и ста́рыя шэс'ь шэ́ляго͡ў.

Ўзёў рабо́тька сваё гро́шы и пашо́ў ў сьвѣтъ. Прышо́ў ёнъ ў адну́ дярэ́ўню, а тамъ дѣти дурэ́юць съ ко́тикомъ. Ўзёў ёнъ и купі́ў за сваё гро́шы ётага ко́тика. Такъ ямў ўпадабо́ў е́ты' ко́тикъ, што ёнъ иде́' па даро́зя и ўсе гла́дить яго́ на шэ́рсьти, а той ямў пѣсьни пяе́'.

До́ўга ёнъ ишо́ў и прышо́ў на по́ля къ мале́нькай старэ́нькай ха́тцы. Папрасі́ўса ёнъ паначава́ть. А ямў й ка́жуть: «Не бу́дешъ ты, до́бры' дяти́на, начава́ть, бо ў насъ щуро́ў[1]) по́ўна!» — «Ничо́га, мо́'а якъ-не́будь перанача́ю!» сказо́ў ёнъ и асто́ўса начава́ть.

Пазале́зьли ты́я ўсѣ ха́тныя на пала́ти, а ёнъ лёгъ на пыдло́зя и ко́тикъ зь имъ. То́лькі назо́ўтра ўсѣ паўзьняли́са, ажъ

---

1) Щуръ — мышь.

ба́чуць: до́ли ля́жы́ць це́лы' лоўжъ[1]) щуро́ў, а се́рэньки' зьвяро́къ сяди́ць ле свайго́ хаджа́нна и мурлы́ча'. Ў той старане́ нема́шъ като́ў, дакъ имъ, тымъ людёмъ, е́та ў дико́вину. Ў разъ яны́ захаце́ли купи́ць е́тага ко́тика, но рабо́тька и слу́хаць не хоча' абъ е́томъ. «Не прада́мъ!» ка́жа' ёнъ: «бо ко́тикъ непрада́жны'».

Та'ды́ яны́ сказа́ли абъ е́томъ свайму́ цару́. Вотъ царъ пазво́ў рабо́тьку съ ко́тикомъ къ сабѣ́ ў дварэ́цъ. Та́мака даю́ць яму́ гро́шы — на со́тни, на ты́сячы ли́чаць, а ёнъ и глядзе́ць на гро́шы не хо́ча'. Та'ды́ яны́ ка́жуць: «Мы апсы́племъ твайго́ ко́тика зо́латомъ!»... Рабо́тька ўзёў ко́тика за пярэ́днія ла́пки и паста́віў яго́ на зямлѣ́. И насы́пали яму́ це́лую ку́чу зо́лата. Забро́ў ёнъ то́я зо́лата ў то́рбу и пашо́ў да́лѣй сваёй даро́гаю.

Наўстрэ́чу яму́ вязу́ць купцы́ царко́ўнаю ла́дань. «Прада́йця, до́брыя лю́ди, мнѣ е́ту ла́дань!» — «А што́ яна́ табѣ́, до́бры' маладецъ?» — «А што вамъ да таго́!» — «Ў тябе́ жъ гро́шэй нема́шъ!»... Рабо́тька паказо́ў имъ зо́лата. «Йдѣ жъ табѣ́, дяти́на, зьвярну́ць е́ту ла́дань?» — «А во тутака, на по́ля и зьвярнѣ́тя!»

Ўзя́ли купцы́ зо́лата, зьвярну́ли ля даро́ги ла́дань, атъѣ́хали тро́ха и глядя́ць, што ёнъ бу́дя' рабі́ць да́лѣй. Ажъ ёнъ запалі́ў ла́дань, ска́ча' круго́мъ агню́ и ўсе гаво́рыць: «Бо́гу на хвалу́! Бо́гу на хвалу́!»...

Пасло́ў Богъ зь не́ба а́нгала папыта́ ца: «чаго́ ёнъ атъ мяне́ хо́ча'?» Ёнъ и атвѣча́я': «Дай мнѣ, Бо́жа, спо́сабъ, кабъ я могъ до́бра на сьвѣ́тя пражы́ць!» Та'ды́ Богъ ча́разъ а́нгала прысло́у яму́ кал'це́ и прутко́къ и сказо́у: «пайди́ жъ ты къ мо́ру и махни́ е́тымъ пру́тикомъ съ кал'ца́мъ!»...

Пашо́ў рабо́тька къ мо́ру и махну́ў кал'ца́мъ. Разбушава́лоса си́нея мо́ра — сьвѣ́ту не вида́ць!.. И вотъ, вы́йшла харо́шая-прахаро́шая дяўчы́на. Паглядзе́ў на яе́ до́бры' мо́ладецъ и ка́жа': «Тяпе́рака ты, кра́сная дзе́ўка, мая́, а я твой!» Такъ яна́ яму́ ве́льми ўпадаба́ла. И пажани́лиса яны́ той жа день.

---

1) Лоўжъ — груда чего-нибудь.

Жывуць яны́ годъ, жывуць други́', а на трэ́йци' годъ жа́на и ка́жа': «Йди къ маёй ма́тцы и скажы́ майму́ бра́ту, пяха́й ёпъ зро́бить гу́сьли, штобъ са́ми йгра́ли, са́ми пѣ́ли и са́ми скака́ли. Даю́ табѣ́ тры дни, и штобъ ты за тры дни зьвярну́ўся!..» И ўзяла́ яна́ шъ шы́и шо́ўкавую ху́сту и написа́ла на е́той ху́сьця письмо́ да сваёй ма́тэры.

Ўзёў ёнъ ту́ю ху́сту и свой прутко́къ и пашо́ў ў даро́гу. Трэ́ба було́ яму́ прайци́ нѣ́сколькі не то сотъ, не то ты́сячъ миль, бо ве́льми дале́ка жыла́ яе́ ма́тка. Вы́йшоу ёнъ ў чы́стоя по́ля, прыки́нуўся я́снымъ со́каломъ и палятѣ́ў шы́бка-шы́бка!..

Яще́ 'дѣ була́ та́я пара́, а ёнъ ўжэ прылятѣ́ў къ сваёй чэ́щы и паказо́ў ей шо́ўкавую ху́сту сь письмо́мъ. Чэ́ща яму́ и ка́жа': «Схава́йса жъ ты, мой зя́тю, бо за́разъ прыляці́ць мой сынъ, дакъ ёнъ тябе́ зьѣс'ь!»...

То́льки ёнъ схаво́ўся ў камо́рку, якъ прылята́я' и той яго́ шва́ґаръ и ка́жа': «што ту́така е́та па́хня'?» Чэ́ща и гаво́рыць: «шва́ґаръ твой прышо́ў къ намъ ў го́сьця и прынёсъ во е́ту шо́ўкавую ху́сту сь письмо́мъ!» Прачато́ў шва́ґаръ письмо́ атъ сваёй сястры́ и вы́пусьціў гасьця́ съ камо́ры.

Вотъ рабо́тька и гаво́рыць свайму́ шва́ґру: «Зробъ мнѣ такія гу́сьли, штобъ са́ми пѣ́ли, са́ми йгра́ли и са́ми скака́ли!» Шва́ґаръ надро́ў то́нка-то́нка абало́ны и завялѣ́ў гасьцю́ сьвяці́ць цѣ́лую ночъ: «Вы́сьвѣцішъ — жыў бу́дешъ, а не вы́сьвѣцішъ, засьнёшъ — зьѣ́мъ!»...

Рабо́тька ве́льми хацѣ́ў зъ даро́ги спаць, али́ жъ ёнъ баяўся шва́ґра́ и за ўсю ночъ и во́комъ не зьвъёў, — вы́сьвѣціў да са́мага дня!..

Ўра́нку шва́ґаръ и ка́жа': «'Азьми́ майго́ каня́ и ѣдь паве́рхъ лѣ́су и паличы́, ско́льки ў лѣ́ся сыро́га и ско́льки сухо́га и да паўдня́ вярни́са!»...

Сѣў ёнъ на таго́ бы́йстрага каня́ и палятѣ́ў, то́льки прутко́мъ сваймъ бъе́' каня́ па галавѣ́, штобъ не разнёсъ, бо то не конь бо́ўў, а нечы́стая си́ла.

Къ са́маму поўдню́ вярну́ўся рабо́тька дамо́ў и сказо́ў, ско́льки

ў лѣся сырóга и скóльки сухóга. Та'ды даў ямý шва́ґаръ ты́и гу́сьли и паѣхаў ёнъ дамóў къ жóнцы.

На дарóзя ў чы́стомъ пóля сустрэка́я' ягó чалавѣ́къ съ тóўстымъ суковáтымъ кіемъ и гавóрыць ямý: «Памѣня́й-ма кій па гу́сьли, а не то я тябе́ забъю́!..» Не хаць́ў ёнъ мѣня́цца, но пабая́ўса съмéрци и памѣнёўса.

Тóльки трóха атайшли́, кій ямý й кажа': «Дóбра ты зрабíў, дя́ци́на, што памѣнёўса: я твае́ гу́сьли атбяру́!..» Паскакóў той кій па дарóзя, дагнóў чалавѣ́ка, — покъ ягó па чомъ не папа́ла и атабрóў гу́сьли...

Идýць яны́ да́лѣй. Наўстрáчу имъ идé' чалавѣ́къ шъ шкурацяно́й тóрбай и ка́жа': «Памѣня́й-ма тóрбу на гу́сьли!» Рабóцька ни туды́: и слу́хаць не хóча', а кій тóркая' ягó и шэпча́: «мѣня́йса, мѣня́йса — я 'тбяру́ гу́сьли!» Ёнъ и памѣнёўса. Сяйчáсъ кій паскакóў-паскакóў па дарóзя, дагнóў таго́ чалавѣ́ка, — покъ ягó па чомъ не папа́ла и атабрóў гу́сьли...

Якъ ишли́, такъ йдуць яны́ да́лѣй. Но вотъ напа́ли на ихъ разбóйники и хаць́ли атабра́ць кій и тóрбу. Но не 'ттуль-не 'цюль ўзялóса мóра. Рабóцька махну́ў сваймъ пруткóмъ, вада́ сащапи́ласа, и ёнъ пашóў, якъ па сухóму, а разбóйники папа́дали ў мóра и патапи́лиса.

Прыхóдя' рабóцька дамóў и пака́зая' жóнцы кій, тóрбу и гу́сьли. Абра́даваласа жóнка, што ёнъ рóўна на трэ́йці' день цэ́лы' ўзьвярну́ўса дамóў. Гу́сьли са́ми пяюць, са́ми йгра́юць и са́ми ска́чуць. Атчыни́ли яны́ тóрбу, ажъ аттýль выхóдяць ра́зныя ва'ська́...

Дачýўса царъ, што ў рабóцька пóўна ўся́кага вó'ська и прысала́я' къ ямý сваіхъ баяроў папыта́цца пра éта. А ёнъ ка́жа': «Дава́й-мо, царъ, паваюемса съ табóю!» Царъ ямý и гавóрыць: «Дóбра, кали́ ты, дя́ци́на, вы́сьцялишъ чóрнымъ суконóмъ дарóгу да майгó дóму, то я бýду съ табóю ваева́цца!» Кій наўчы́ў рабóцька такъ атчыни́ць тóрбу, што зь яé пацягнýлоса чóрное сукнó да са́мага ца́рскага дварца́.

Вы́йшли яны́ та'ды ваева́цца. Якъ расхади́ўса кій, дакъ

адúнъ паклóў ўсе цáрськоя вó'ська. Бáча' царъ, што пичóга зь имъ не зрóбишъ и стоў мирыцьца...

Пазвóў царъ рабóтьку къ сабѣ́ ў палáты. Прышóў рабóтька къ царý: кій, тóрбу и гýсьли пакúнаў ў сянёхъ, а самъ вайшóў ў палáту съ царóмъ гаварыць. Вотъ нѣйки' вéльми вáжны' князь хатѣ́ў ў сянёхъ пакрáтаць тóрбу, ажъ кій якъ выцця' ягó па руцэ́, што рукá пераламúлась! Самъ царъ хацѣ́ў нéчага выйцi на дворъ, ўбачыў ў сянёхъ гýсьли, ўздýмаў паглядзѣ́ць ихъ, но кій пыднёўса и трóха што не выцяў ягó па руцэ́!..

Спужóўса царъ и аддóў рабóтьку палавúна свайгó цáрства.

Та'ды́ рабóтька, дóбры' маладéцъ, вярнýўса дамóў къ свасéй жанѣ́ и стоў самъ царóмъ.

С. Жытинъ.
Казóў Ивáнъ Халóдны'.

II.

Котъ-лавýнъ.

Ў аднагó чалавѣ́ка бóўў котъ. Ёнъ ўжэ сасгáраўса и ня могъ лавúць щурóў, а стоў рабúць шкóду: то гарщóкъ абéрня', то сьмятáну паѣ́с'ь. Той чалавѣ́къ ўзёў ягó и атвéзъ ў лѣсъ.

Ў лясý ўглéдила ягó лисá и папытала, хто ёнъ таки' ес'ь. Ёнъ и сказóў: «я котъ-лавýнъ!» — «Дакъ давáй съ табóй пажэ́номса, бýдомъ ўдвохъ жыць и дóбра дружыць!» Пажанúлиса яны́.

Лисá завялá катá ў сваю́ пячýрку, а самá пáшла на прóмысялъ. Ўкрáла нéйдя кýрыцу да й нясé'. Сустрэ́ў яé воўкъ да и кáжа': «Я 'тбяру́ 'ць цябé éту кýрыцу!» А лиса ямý кáжа': «Нѣ', не 'тбярэ́шъ, вóўча, бо ў мяпé дóма мужъ ес'ь, котъ-лавýнъ, ёнъ цябé 'злóвить и задярэ́!» 'Спужóўса воўкъ и ўцёкъ атъ лисы́.

На другúй' день лисá 'злавúла кáчку и нясé' дамóў. Сустрэ́ў яé мядьвéдь. «Я 'тбяру́ 'ць цябé éту кáчку!» — «Нѣ', не 'тбярэ́шъ, мядьвéдю, бо ў мяпé мужъ ес'ь, котъ-лавýнъ, ёнъ цябé задярэ́'!» 'Спужóўса и мядьвéдь.

На трэйти' день лисá ўкрáла гусь и нясé' сабѣ́ дамóў. Сустрэ́ў яé леў. «Я 'тбяру́ éту гусь!» — «Нѣ', лéва, не 'тбярэ́шъ, — ў мяné мужъ ес'ь, котъ-лавýнъ, ёнъ тябé паймáя' и задярэ́'!» Спалóхаўса и леў, пусьтíў лису́ и самъ сабѣ́ дýмая': «Што éта тáмака за зьвѣръ: я ўсѣмъ зьвярóмъ царь, а яки́'сь-то котъ-лавýнъ старшы мяné!»...

Сабралóса ўсе зьвяръé ў лѣ́ся на савѣ́тъ и кáжуть: «Што éта тáмака ў нáшай лисúцы за страшны' мужъ, котъ-лавýнъ? Няхáй-ка янá пакáжа' намъ ягó!» А лисá имъ и гавóрыть: «Вотъ, брáтки зьвярэ́, якъ жа я вамъ пакажу́ свайгó мýжа: котъ-лавýнъ якъ вылѣ́зя' сь пячýрки — паѣс'ь ўсѣхъ васъ! Трэ́ба зрабúть такъ, штобъ ёнъ васъ не бáчыў. Я васъ наўчý: ты, леў, прытягни́ ў ноччы каня́ къ маéй пячýры; ты, мядьвѣ́дь, — коровý, а ты, воўкъ, — вéпра. Сáми вы пахаваíцеса, а я выведу ягó ѣ́сьти; та'ды́ вы и ўбáчыця катá-лавуна́!» Такъ яны́ й зьдѣ́лали, якъ сказáла имъ лисá.

Пячýра булá на курганѣ́ пры балóтя[ѣ], а тутъ на потярабя[ѣ] стаéў стогъ сѣ́на. Леў схавóўса пыдъ éты' стогъ, мядьвѣ́дь ўзьлѣзъ на ель, а воўкъ ўлѣзъ ў лоўжъ. Жду́ть яны́ катá-лавуна́ и трасýтца атъ стрáху...

Якъ выйшаў котъ-лавýнъ, да якъ закарнёукаў: «мау-маўмаў!..» Зьвяръé и дýмая', што éта котъ-лавýнъ крычы́ть, што́ ямý ўсягó éтага мáла. Папужáлися яны́ да сьмéрти. Паказáлоса йльву, што ягó хвостъ видáть 'съ-пыдъ стогу. Хатѣ́ў ёнъ пыттягти́ свой хвостъ пытъ стогъ. А котъ-лавýнъ, дýмая', што éта щуръ, — кúнауса на ягó и учапíуса киптямы у сáмы' канéцъ хвастá. 'Спужóуса леу, усхапíуса 'съ-пытъ стóга да спóпырску на лоужъ, на ваука́. А той, дýмая', што на ягó насѣ́ў котъ-лавýнъ, ускóчыу, да утякáть. А котъ-лавýнъ якъ хы́ркня', да на ель къ мядьвѣ́дю. Бáча' мядьвѣ́дь, што не паласá, да 'бъ зéмлю зь éли. Кúнулоса зьвяръé наутякачá, куды́ вóчы глядя́ть...

Сабрáлоса пótымъ зьвяръé у кýчу и узноу савѣ́таютца. Леў и гавóрыть: «Алé жъ якú' страшны' зьверъ: якъ учапíуса мнѣ́ ў хвостъ, дакъ я чуть утёкъ!» Воукъ кáжа': «А на мяné у лóужы

якъ усьсёу, трóха не задушы́ў! А мядьвѣ́дь гавóрыць: «Охъ, и на мяне́ якъ ки́науса, дакъ я чуць саскóчыў зь е́лки!..» — «Ну й прóуда жъ, што котъ-лавýнъ страшнéй насъ ўсѣхъ!..»

А хи́трая лиси́цка и чапéръ жы́ве' съ катóмъ-лавунóмъ.

Д. Ляўки́.
Казóў Ціmахвéй Хвядóсоў.

III.

Гаўры́ла и сынъ яго Дани́ла.

Жы́ў-бóўў дѣ́дъ Гаўры́ла и бóўў ў яго́ сынъ Дани́ла. Прышлá парá жани́ць сы́на. Вотъ и гавóрыць Дани́ла: «Жани́ мяне́, бáцька, а то я печъ пабъю́!» — «За што жъ я цябе́, сы́нку, жани́ць-му?» — «Прадáй быкá!» Быкъ, пачýўшы éта, зарóў да и утёкъ у лѣсъ. Сынъ узноу кáжа': «Жани́ мяне́, бáцька, а то печъ пабъю́!» — «За што жъ, сы́нку, жани́ць-му?» — «Прадáй барана́!» Барáнъ забляёў да й пабѣгъ ў лѣсъ. Сынъ кáжа': «Жани́ мяне́, бáцька, а то печъ пабъю́!» — «За што жъ, сы́нку, жани́ць-му?» — «Прадáй кабана́!» Кабáнъ завищóу да й махнýў ў лѣсъ. Та'ды́ сынъ кáжа': «Прадáй гусь и жани́ мяне́, бáцька!» Гусь заґаґатáла и у лѣсъ палятѣ́ла. Напасьлѣ́дакъ сынъ кáжа': «Прадáй, бáцька, хаць пѣ́ўня да й жани́ мяне́!» Пѣ́вень запѣ́ў да й у лѣсъ палятѣ́у.

Сабрáлиса у лѣ́ся: быкъ, барáнъ, кабáнъ, гусь и пѣ́вень, — и савѣ́таютца мижъ сабóю, якъ зи́му зимавáць. Быкъ и гавóрыць тавáрашамъ: «Зрóбимъ сабѣ́ хáту, а то хóладна бýдя'!» Барáнъ атвячáя': «Ў мяне́ дóугая и густáя вóуна, дакъ мнѣ́ цёпла бýдя' й бясъ хáты!» Кабáнъ кáжа: «А я уры́юса ў зямлю́, дакъ мнѣ́ й цёпла бýдя'!» Гусь съ пѣ́унемъ крычáць: «Мы стáномъ на 'дной назѣ́, галаву́ пыдъ крылó палóжымъ, дакъ намъ и цёпла бýдя'!»

Быкъ адúнъ зрабíў сабѣ́ хáтку да й жывé' ў ей памáленьку. Прышлá зимá, стáла хóладна. Прыхóдиць къ бы́ку кабáнъ и прó-

ситца пагрэ́тьца. Быкъ яго́ не хатѣ́у 'пусьти́ть, но кабанъ стоу́ грази́ть: «Я тваю́ ха́ту пыдры́ю, дакъ и табѣ́ хо́ладна бу́дя'!» Быкъ 'спужо́уса и 'пусьті́у къ сабѣ́ кабана́. Прыхо́дить и бара́нъ и гро́зить: «Пусьти́, бы́ча, мяне́ у́ ха́ту, а то я разгану́юса, да якъ сту́кну йлбомъ у сьтѣ́ну, то й ха́ту разбуру́!» Прышло́са 'пусьти́ть у ха́ту и барана́. Прылятѣ́у пѣ́вень и гро́зить раскапа́ть усю зямлю́ на ха́тя и пыдъ ха́тай, кали́ яго́ не 'пу́сьтять пагрэ́тьца. 'Пусьти́ли у ха́ту й пѣ́уня. Прылятѣ́ла й гусь и гро́зить, што павы́даубая' дю́бкай увесь мохъ у ха́тя, кали́ не 'пу́сьтять яе́ пагрэ́тьца. 'Пусьти́ли у ха́ту й гусь.

Сабра́лиса усѣ́ яны́ у ха́ту, жыву́ть, весяля́тца: быкъ раве́', бара́нъ бляе́', кабанъ ру́хая', гусь ґаґо́ча, а пѣ́вень пяе́'...

Шу́ла е́та ли́са, пабѣ́гла къ мядьвѣ́дю и гаво́рыть ямý: «Паслу́хай, кумъ, ту́така` ля насъ ес'ь до́брая паяде́ньня!»

Пашли́ яны́ умясьтёхъ къ ха́тя. Лиса́ атчыни́ла дьве́ры. Толькн мядьвѣ́дь усу́нуу́са у хату, якъ на яго́ наки́нулиса у́сѣ: быкъ ко́ля` рага́мы, кабанъ йрве' клыка́мы, бара́нъ бъе' йлбомъ, гусь щы́пля' дю́бкаю, а пѣ́вень уско́чыу на жэ́рдку да й крычы́ть на усе го́рла: «куда́-куда́-куда́!..»

Мядьвѣ́дь зь лисо́й чуть утякли́ съ ха́ты. Адбѣ́гли яны́ тро́ха да й спо́рать. Мядьвѣ́дь ка́жа': «Ну, кума́, и падвяла́ жъ ты мяне́: тро́ха ба́бы е́тыя не задуши́ли мяне́ у ха́тя, — адна́ ко́ля' ви́лкамы, друга́я йлбомъ сту́кая', трэ́йтя' зуба́мы куса́я`, ч'во́ртая киптя́мы щы́пля`, а пъя́тая уско́чыла на жэ́рдку да й крычы́ть аттýль: «пада́й мнѣ́ яго́ сюда́-сюда́-сюда́!..» Е́та ба́ба, ви́дна, хатѣ́ла мяне́ павѣ́сить пыдъ сто́льлю на жэ́рдцы. Бо́лѣй у́сѣхъ я спужо́уса е́тае ба́бы!»

А быкъ, бара́нъ, кабанъ, гусь и пѣ́вень и чапе́рака жыву́ть у́ ха́тцы.

Д. Щыткавичы.
Казо́у Пятро́къ Пи́льщыкъ.

IV.

Нéсьтярка.

Жыў сабѣ Нéсьтярка, булó ў ягó дѣтакъ шэсьтярка, рабúць лянúтца, а крáсьти байтца.

Вотъ адúнъ разъ ѣдя' сьвяты' Юрэй ѣъ Бóгу на савѣтъ. Ўстрэчáя' ягó Нéсьтерка да й пытáя': «Кудá ты ѣдешъ, сьвяты' Юрэй?» — «Ѣду ѣъ Бóгу на савѣтъ!» — «Пакланúса тамъ аба мнѣ; якъ мнѣ жыць на сьвѣтя: рабúць лянюса, а крáсьти баюса, дѣти ўмырáюць, ѣсьти хóчуць!» — «Лáдна, Нéсьтярка, пакланюса!» — «Нѣ', сьвяты' Юрэй, ты забýдешъ аба мнѣ!» — «Кажý табѣ, што не забýду!» — «Ну дакъ пакúнь мнѣ на залóгъ сваé сядлó!» Пакúнаў Юрэй сваé сядлó Нéсьтярку, а самъ паѣхаў дáлѣй бесь сядлá.

Прыѣхаў сьвяты' Юрэй ѣъ Бóгу и стоў нéрадъ имъ. Пра ўсе расказбў ёнъ Бóгу, а пра Нéсьтярка такъ и забýў. Богъ и кáжа' ямý: «Паѣжджáй, Юрэй, загубú стрáшную зьмяю!» Выйшаў Юрэй на дворъ и тýтака тóльки ўспóмніў пра Нéсьтярка, што ў яго дѣтакъ шэсьтярка, рабúць лянúтца, а крáсьти байтца. Вярнýвса ёнъ ѣъ Бóгу и гавóрыць: «Пасавѣтай, Бóжа, якъ жыць на сьвѣтя Нéсьтярку, дѣтакъ ў яго шэсьтярка, рабúць ёнъ лянúтца, а крáсьти байтца; дѣти ўмырáюць ня ѣўшы?»

Вотъ Богъ и атвячáя: «Скажы, Юрэй, Нéсьтярку, што ўсе, што ёнъ ў каго вóзьмя', — то яго́!»

Прыѣхаў Юрэй къ Нéсьтярку. «Здарбў, Нéсьтярка!» — «Здарбў, сьвяты' Юрэй!» — «Я пакланёўса Бóгу апъ тябѣ!» — «Дзякý' табѣ за éта, — што казбў Богъ?» — «Ёнъ казбў, што ўсе, што ты ў каго вазьмéшъ, то тваé!» — «Лáдна, такъ я й жыць-му па Бóжжаму савѣту!» — «Ну, а йдѣ жъ, Нéсьтярка, маé сядлó?» — «Да ў мяне́ жъ, сьвяты' Юрэй!» — «Дакъ давáй жа мнѣ яго́!» — «Нѣ', сьвяты' Юрэй, па Бóжжаму савѣту янó ўжэ маé!»...

Паѣхаў Юрэй бесь сядла́, куда́ яму́ Богъ сказо́ў. А Не́сьтярка прадо́ў залато́я сядло́ бага́таму чалавѣ́ку и палучы́ў за яго́ мно́га гро́шы.

Не́сьтярка пастро́іў сабѣ́ до́брую ха́ту и дворъ и стоў жыць замо́жна.

Д. Крамо́къ.
Казо́ў Хве́даръ Мащано́къ.

Стары́нныя ра'ска́зы.

(Легенды).

Ракъ.

Богъ твары́у сабѣ́ мі́ръ. У̀сѣ тва́ры прышлі́ къ Ямý и пакланѝлиса. Богъ у̀ста́віў ка́жнай тва́ры во́чы, штобъ у̀сѣ паглядѣ́ли на Яго́. Пасля́ у̀сѣхъ прывбу́кса ракъ. «Йдѣ жъ ты, ракъ-небара́къ, валачы́уса до́сюль?» спра́шая' Богъ. «По́ркаўса та́мака ў карчо́хъ!» атвячая' ракъ и не кла́няетца Бо́гу. «'Азьми́, ра́ча, сабѣ́ во е́тыя во́чы, яки́я ту́така заста́лиса!» сказбу̀ яму Богъ. Ракъ пащу́паў сваймі клюшна́мы ты́я во́чы да й ки́наў ихъ ныдъ но́ги Бо́гу. «'Азьми́ ихъ Сабѣ́, е́тыя пага́ныя во́чы, и у̀стоў, куды хо́чэшъ, а мнѣ таки́я во́чы ня трэ́ба!» Ракъ го́рда сказбу̀ и атвярну́вса къ Самаму́ Бо́гу за́домъ. «Дакъ ня Мнѣ жъ е́тыя во́чы трэ́ба, пага́ны' ракъ, а табѣ́!» заграмѣ́ў Богъ и у̀ста́віў ра́ку во́чы ў задъ.

Съ тыхъ поръ ў̀ всѣхъ тва́рэй во́чы-якъ вочы, а ў̀ ра́ка во́чы зза́ду.

Мядьвѣ́дь.

Було́ е́та даўно́! Богъ са сваймі сьвятца́мі йшоў̀ па дарбзя. У̀сѣ лю́ди кла́нялиса Ямý, а адинъ галу́за-безба́тькавичъ стоў̀ дражни́тьца. Сьвятцы́ до́ўга угава́ровали е́тага галу́за, но ёнъ ихъ ня слу́хаў̀. То съ аднае́ страны́ ки́нетца на Бо́га, то зъ другі́я, а Богъ иде́' у̀се свае́й дарогай и не гляди́ть на яго́.

Та'ды́ галу́за забѣ́гъ напе́радъ, схавоу́са за яварыну и сядзи́ць. А Богъ идe' сабѣ́ ці́ханька па дарозя, а за Имъ сьвятцы́. То́льки што Яны́ параўня́лиса зь яварына́й, якъ аттуль вы́скачыў галу́за, прысе́ў на кара́чки, вы́цягнуў мо́рду да на Бо́га «гы-ы-ы!»...

Не стоў цярпе́ць бо́лей е́тага Богъ и сказо́ў: «Ўвесь свой вѣкъ ты хади́ць-'мешъ такъ, якъ чапе́рака ходишъ!»...

Съ тыхъ поръ и хо́дить той галу́за мядьве́демъ на кара́ччкахъ, вы́ставіўшы мо́рду.

С. Жы́цинъ.
Казо́ў Ива́нъ Жыцяно́къ.